«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Неўзабаве пасля “Маршу недармаедаў” у Мінску распачаліся затрыманні фота відэа дапоўнена

15.03.2017 **Тэгі**: свабода мірных сходаў, затрыманні



Грамадзянскія назіральнікі і карыстальнікі сацыяльных сетак паведамляюць пра затрыманні актывістаў анархісцкага руху, якія спрабавалі з'ехаць ад месца заканчэння "Маршу недармаедаў" у Мінску.

Адразу пасля завяршэння акцыі, калі яе ўдзельнікі пачалі разыходзіцца з пляцоўкі каля рэстарана McDonald's, анархісты прасілі людзей правесці іх да прыпынку грамадскага транспарту, каб яны маглі пазбегнуць затрыманняў. Іх пасадзілі ў тралейбус. Тым часам праваабаронца **Валянцін Стэфановіч**, які там знаходзіўся, чуў, як людзі ў цывільным пачалі перамаўляцца па рацыі наконт маршрута тралейбуса, на якім з'ехалі актывісты.

На відэа людзі дапамагаюць актывістам сесці ў тралейбус:



Відавочна, што праехаць ім давялося няшмат.

У хуткім часе ў сацыяльных сетках з'явіліся паведамленні, што на прыпынку насупраць казіно "Белая вежа" па вуліцы Максіма Багдановіча людзі ў цывільным пачалі ўрывацца ў тралейбус і "скруцілі" дзяўчыну з барабанам, білі яе падчас затрымання.

У іншым паведамленні відавочцы напісалі, што сталі сведкамі затрымання актывістаў з двух тралейбусаў на гэтым прыпынку. На відэа - тралейбус пасля затрымання:



Падчас затрыманняў у салоне тралейбуса людзі ў цывільным распылялі слёзацечны газ, ад чаго пацярпелі звычайныя пасажыры.

Колькасць і імёны затрыманых назіральнікі і праваабаронцы высвятляюць.

Сярод затрыманых - дзяўчыны, чые імёны вядомыя:
Елізавета Пракопчык, **Марына Дубіна, Алена Дубовік**. Меркавалі, што яны дастаўлены ў РУУС Першамайскага раёна, але там гэтую інфармацыю не пацвердзілі. Пазней высветлілася, што Елізавета Пракопчык і Марына Дубіна знаходзяцца ў РУУС Першамайскага раёна, а Алена Дубовік - у РУУС Цэнтральнага раёна. Там, па інфармацыі ад затрыманага актывіста **Пятра Маркелава**, усяго 30 - 35 удзельнікаў акцыі, але іншыя крыніцы гэтую лічбу не пацвярджаюць.

Назіральнікі, якія дзяжураць пад РУУСам, чулі інфармацыю пра 16 затрыманых.



Прыблізна ў 20:35 да РУУСа Цэнтральнага раёна пад'ехала машына "хуткай дапамогі". Верагодна, камусьці з затрыманых стала дрэнна. Маці адной з іх паведаміла, што дзяўчын моцна збівалі. Ад яе стала вядома імя яшчэ адной дзяўчыны, што знаходзіцца ў РУУСе, - **Юлія Філіпава**.

Апроч таго, высветлены імёны наступных затрыманых: **Алег Аўдзеенка**, **Анастасія Ранько**, **Аляксандр Скурыдзін, Юрый Пішчулін, Ілля Міраненка, Станіслаў Русакоў, Ян Мурашка** (непаўнагадовы, якога адпусцілі з Цэнтральнага РУУСу пасля складання пратаколаў па артыкулах 23.34 і 23.4 КаАП), **Яўген Жураўскі**.

Па інфармацыі ад Яна Мурашкі, у Цэнтральным РУУСе сярод затрыманых - двое непаўнагадовыя, чатыры дзяўчыны, усіх білі пры затрыманні і пасля яшчэ "дадалі" ў пастарунку.



Людзі чакаюць інфармацыі пра затрыманых пад Цэнтральным РУУСам

Таксама да назіральнікаў паступаюць паведамленні пра людзей, якія не вярнуліся дадому з акцыі: **Сінкавец Аляксандр**, **Немік Алена**, **Яновіч Святаслаў.**


Стала вядома, што было затрымана 11 чалавек яшчэ да мітынгу каля метро і ў самім метро і дастаўленыя ў Першамайскі РУУС.

Таксама быў затрыманя **Арсеній Канаплёў**, які пайшоў на марш адзін і не вярнуўся, бацькі высветлілі, што ён на Акрэсціна.

Опубликовать








Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе


Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года (дакумент)

Метамарфозы суда: дальнабойшчыка абвінавачвалі за падрыў петарды, але асудзілі за ўдзел у экстрэмісцкім фармаванні

Мінімум 12 затрыманых: што вядома пра рэйд КДБ на адвакатаў

Заява аб прызнанні Васіля Палякова палітычным зняволеным

Заява аб прызнанні сямі чалавек палітычнымі зняволенымі

Бацьку траіх дзяцей асудзілі да года калоніі за каментары ў сацсетках

"Хто дапамагае з перадачамі?" Падрабязнасці масавага рэйду сілавікоў на сваякоў палітвязняў (дапоўнена)

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Студзень 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА





















СЯБРОЎСТВА







#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

